*ARKUSZ ZAWIERA INFORMACJE PRAWNIE CHRONIONE DO MOMENTU ROZPOCZĘCIA EGZAMINU!*

**Miejsce na naklejkę**

*dysleksja*

**MOB-R1_1P-092**

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

**Czas pracy 180 minut**

**MAJ ROK 2009**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **60 punktów**

*Część I – 15 pkt*
*Część II – 45 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

# CZĘŚĆ I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Сяргея Дубовіка і адкажы на пытанні. Адказвай выключна на аснове тэксту і толькі сваімі словамі, або згодна з патрабаваннямі задання.**

Сяргей Дубовік

***Па калідорах вітрынных кнігасховішчаў***
(скарочана)

**1.** З развіццём інфармацыйных тэхналогій многае ў такім звыклым нам свеце пачало змяняцца. Вучоныя-футуролагі[1] прагназуюць, што ў хуткім часе ўся тэхніка ў кватэры будзе ўключацца пры дапамозе голасу альбо мабільнага тэлефона. Ужо зараз у некаторых краінах пачынаюць укараняцца простыя хатнія робаты[2], а да нас прыходзіць электронная кніга і як вынік – электронная бібліятэка. Ці заменіць яна кнігу папяровую? Чаму шмат для каго зручней «хадзіць» у віртуальную бібліятэку? Гэтыя і іншыя пытанні паспрабуем разгледзець...

**2.** Як і многія іншыя традыцыі Інтэрнэта, арганізацыя электронных бібліятэк прыйшла да нас не з Захаду, а з Расіі. У прыватнасці, піянерам[3] віртуальнага кнігасховішча на постсавецкай прасторы па праве лічыцца Максім Машкоў. Яго старонка ў Інтэрнэце не вылучаецца адмысловым дызайнам[4], анімацыяй. Папулярнасць набываецца за кошт электронных кніг ды спасылак на іншыя бібліятэкі.

**3.** У артыкуле, прысвечаным гісторыі свайго праекта, Максім адзначае, што ў сярэдзіне 90-х тэксты твораў складзіраваліся ў сеціве абы-як: розныя фарматы дадзеных, адсутнасць адзінай кадзіроўкі. Прыкладна 2 гады спатрэбілася піянеру постсавецкай бібліятэчнай інтэрнэт-прасторы на збор і ўпарадкаванне пачатковай бібліятэчнай базы. А потым да праекта пачалі далучацца многія людзі: чытачы, пісьменнікі, нават выдаўцы...

**4.** У электроннай бібліятэцы Машкова (як і ў многіх іншых) няма нейкіх тэматычных прыярытэтаў. Людзі скануюць і дасылаюць у фонды[6] толькі тыя кнігі, якія насамрэч[7] папулярныя і запатрабаваныя чытацкай аўдыторыяй.

**5.** Папулярнасць свайго праекта спадар Машкоў тлумачыць наступным чынам: «Гэту бібліятэку падбіраў не выдавец (абы набывалі); не пісьменнік, якому не важна, хто прыйдзе, абы толькі данесці сваё слова да ўсіх прыйшоўшых. Гэта бібліятэка для чытача, сабраная чытачом...»

**6.** Што ж рухала вядомым бібліятэкарам-энтузіястам? Праект [...] не з'яўляецца камерцыйным, а сканаванне кніг – вельмі няпростая справа. Машкоў піша ў адказ наступнае: «Мне проста хочацца, каб кнігі знаходзілі свайго чытача, таму што мне страшна было б жыць у свеце, у якім не чытаюць кніг».
Трэба зазначыць, што падобных бібліятэк у сеціве вельмі шмат. Як універсальных, так і спецыялізаваных... [...] А як складаюцца справы з электроннай кнігай у Беларусі?

---

[1]Футуролаг – вучоны ў галіне футуралогіі, якая займаецца прагназаваннем (прадбачаннем) новых сацыяльных працэсаў
[2]Робат – аўтамат, які выконвае складаныя дзеянні, падобныя да дзеянняў чалавека
[3]Піянер – тут: пачынальнік, той хто першы заснаваў што-небудзь
[4]Дызайн – мастацкае апрацаванне
[6]Фонд – сховішча (тут: віртуальнае) кніг
[7]Насамрэч – сапраўды; у сапраўднасці

**7.** З беларускіх праектаў, на мой погляд, можна адзначыць два сайты [...]. Тут захоўваюцца як беларускамоўныя, так і рускамоўныя тэксты. Першы хоць і часткова камерцыйны, але ж прадстаўляе жадаючым магчымасць бясплатна спампаваць[8] тэксты твораў класікаў айчыннай прозы і паэзіі. Другі праект (таксама бясплатны, дарэчы створаны крышку пазней за бібліятэку Машкова) можа спатрэбіцца не толькі вучням ці студэнтам па курсе беларускай літаратуры, але і больш дасведчанай аўдыторыі. Тут можна знайсці рэдкія творы беларускіх паэтаў і празаікаў, як класічных, так і сучасных. Сярод іх – Алесь Разанаў, Паўлюк Багрым, Цётка, Максім Танк... Усіх не пералічыш! Ёсць тут асобы, якія ўжо ўвайшлі ў аналы[9] гісторыі айчыннай літаратуры, ёсць і сучасныя творы...

**8.** [...] Дарэчы сёння некаторыя літаратары выстаўляюць свае творы для ўсеагульнага доступу на ўласных персанальных інтэрнэт-старонках. Чакаць выдання кнігі можна вельмі доўга. У глабальным сеціве любы аўтар мае магчымасць выставіць на суд чытачоў любы твор і чакаць на яго водгукі на [...] уласным форуме. Адзін з прыкладаў – сайт нашага аўтара і чытача, журналіста і літаратара Валерыя Гапеева. А колькі яшчэ такіх у сеціве?!

**9.** Атрымліваецца, што папяровая кніга і традыцыйная бібліятэка ў недалёкай будучыні могуць саступаць свае пазіцыі бібліятэцы і кнізе электроннай. У Інтэрнэце няма чэргаў, праблем з наяўнасцю неабходнай літаратуры, запазычанасцяў у чытачоў, грашовага залога, пад які выдаюцца кнігі, існуе лёгкая сістэма пошуку тэкстаў, можна эканоміць[10] на пасадах штатных[11] бібліятэкараў...

**10.** У апошні час многія кажуць аб меншай цікавасці да кнігі. Прычым гэта агульнасусветная тэндэнцыя. Часам падаецца: «Навошта купляць той ці іншы раман, калі яго можна лёгка спампаваць?» Дый ці заменіць надалоннік[12] ноўтбук папяровую кнігу? Ёсць два супрацьлеглыя меркаванні. Першае – не заменіць ніколі, бо трывалыя, традыцыйныя каштоўнасці чалавечай цывілізацыі застаюцца. Гэта пацвердзіла сітуацыя з кіно і тэатрам. Тэатр застаўся, але зрабіўся больш элітарным. Магчыма, нешта падобнае атрымаецца і з папяровай кнігай, і з сучаснай традыцыйнай бібліятэкай, якая зараз усё больш нагадвае не столькі кнігасховішча, колькі інфацэнтр[13]... Другое – электронная кніга можа наогул выцесніць сваю «папяровую сястру». Гэта тлумачыцца палітыкай зберажэння лясных рэсурсаў[14]. Нават у нашы дні ў некаторых міністэрствах і ведамствах задумваюцца пра агульны пераход да электроннага справаводства, каб эканоміць паперу, і робяць да гэтага пэўныя захады...

**11.** Таксама адчуваецца цікаўнасць да электроннай кнігі. У прыватнасці, ЮНЕСКА ажыцяўляе праект «Электронная бібліятэка – школьніку», у межах якога ўжо выпушчаны кампакт-дыскі з творамі школьнай праграмы па рускай і беларускай літаратуры.

Уваходзяць у шырокае карыстанне і «надалоннікі» – кішэнныя камп’ютэры. Некаторыя з іх нават спецыяльна адаптаваныя для чытання. А статыстыка наведвання некаторых віртуальных бібліятэк можа значна перавышаць колькасць чытачоў у традыцыйных бібліятэках. Ужо сёння трэба зазірнуць у будучыню і прапрацоўваць усе магчымыя варыянты, сярод якіх самым трывіяльным будзе адміранне папяровых кніг і традыцыйных бібліятэк...

Дубовік С. *Па калідорах віртуальных кнігасховішчаў* // ЛіМ. 2007, 24 жніўня, с. 16.

[8]Спампаваць – сцягнуць з Інтэрнэта змест твора
[9]Аналы (толькі ў множным ліку) – запісы гістарычных падзей у храналагічным парадку
[10]Эканоміць – ашчаджаць, менш расходаваць грошы
[11]Штатны – які ўваходзіць ў штат працаўнікоў прадпрыемства; працаўнік прыняты на работу на поўны штат
[12]Надалоннік – малых памераў, які змяшчаецца на далоні
[13]Інфацэнтр – цэнтр інфармацыі
[14]Рэсурсы – запасы, крыніцы чаго-небудзь

## Заданні да тэксту

### Заданне 1 *(1 пункт)*
**Якую функцыю выконваюць пытанні, пастаўленыя ў 1-м абзацы?**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

### Заданне 2 *(1 пункт)*
**Якія змены прагназуюць вучоныя-футуролагі? Адкажы на аснове 1-га абзаца.**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

### Заданне 3 *(2 пункты)*
**Пачынальнікам віртуальных бібліятэк на постсавецкай прасторы лічыцца Максім Машкоў. Дай 2 прыклады змен, якія ўвёў Машкоў у бібліятэчнай інтэрнэт-прасторы. Карыстайся 3-м абзацам.**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

### Заданне 4 *(1 пункт)*
**На аснове 4-га і 5-га абзацаў высветлі значэнне слоў Максіма Машкова «бібліятэка для чытача, сабраная чытачом».**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

### Заданне 5 *(1 пункт)*
**Чым кіраваўся Машкоў, ажыццяўляючы праект віртуальнай бібліятэкі? Карыстайся 6-м абзацам.**

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

## Заданне 6 *(1 пункт)*

**Напішы, якую функцыю выконвае клічнік у 7-м абзацы?**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

## Заданне 7 *(1 пункт)*

**Растлумач, чаму некаторыя літаратары выстаўляюць свае творы ў Інтэрнэце? (на аснове 8-га абзаца).**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

## Заданне 8 *(1 пункт)*

**У 9-м абзацы аўтар уводзіць слова «саступаць». Раскрый значэнне гэтага слова.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

## Заданне 9 *(1 пункт)*

**На аснове 10-га абзаца растлумач, чаму аўтар падаў у двукоссі словазлучэнне «папяровая сястра».**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

## Заданне 10 *(2 пункты)*

**На аснове ўсяго тэксту высветлі значэнне загалоўка.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

## Заданне 11 *(2 пункты)*

**Выберы два правільных значэнні. У пададзеным тэксце аўтар:**

**а)** прадстаўляе біяграфію і дзейнасць Максіма Машкова;
**б)** прадстаўляе гісторыю электорннай бібліятэкі Максіма Машкова;
**в)** прадстаўляе характэрныя рысы творчасці Максіма Машкова;
**г)** прадстаўляе характарыстычныя рысы беларускіх электронных бібліятэк;

## Заданне 12 *(1 пункт)*

**Вызнач слова, якое не належыць да лексікі Інтэрнету.**
спампаваць; павук; сеціва

# CZĘŚĆ II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu

**Ta część zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność tworzenia własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden z nich i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1: Паэты пра таталітарызм. Параўнай творы Ларысы Геніюш ******Крывёй напоўніліся поймы рэк*** **і Васіля Супруна** ***Чаго я хачу?*****.**

Ларыса Геніюш

****** Крывёй напоўніліся поймы рэк***

Крывёй напоўніліся поймы[1] рэк,
Бурліць адчаем слёз людскіх разводдзе.
Гляджу на свет. Я – лагернік, я – зэк[2],
Засуджаны на мукаў чвэрцьстагоддзя.

Мяне драты, сабакі сцерагуць,
Дзікіх надзораў зграя нада мною,
І лоб штодня мой на прыцэл бяруць
Навучаныя забіваць канвоі.

Мне ўсё ўзялі, разбурылі сям'ю,
Кіркой[3] прабілі лёс мой чалавечы,
Ланцуг накінулі на шыю салаўю
І між сабою падзялілі рэчы.

Натоўп дзяўчат, жанчын, яшчэ жывых,
Йдзем зледзянелай тундры каляінай,
Папраз[4] снягі, мароз сцінае дых,
Мароз шукае песні салаўінай.

Канвой яе шукае і надзор,
Я йду пургой[5], завеяная снегам,
Гляджу ваўком усёй дзікасці ў дакор,
Не, маю душу прашманаць[6] ім нельга!

На вуснах песня, мой апошні дых,
Цяплом з-пад сэрца словы саграваю,
Жывая я яшчэ сярод жывых,
У душы маёй і Беларусь жывая!!!

Васіль Супрун

***Чаго я хачу?***

Крывадушна пытаеце: – Што я хачу?
Чаго дабіваюся прагна?
За што так жыццём безаглядна плачу.
Ваш «рай» называючы багнам?

Так чуйце ж распраўаў дзікунскіх крукі,
што сыты крыўёю людскою:
– Хачу, каб зваліся між нас павукі,
хачу для Радзімы спакою.

Каб край дарагі нам не быў краем слёз,
Народ не жабрачыў бяспраўна,
каб путы няволі і здзекі не нёс,
а быў між другіх раўнапраўным.

Хачу, каб за праўду не гналі ў Сібір,
па дваццаць пяць год не давалі,
каб брат свайго брата за страх не губіў,
«сіксоты»[7], як цень, не снавалі.

Хачу, як і людзі народаў другіх,
жыць вольна ў сваёй Беларусі.
І веру, што турмы, суды, ланцугі
рабамі стаць нас не прымусяць.

Геніюш Л. ****Крывёй напоўніліся поймы рэк // Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* Склад.: В. Сянкевіч і Я. Грыгарук. Warszawa, 2001, s.315.
Супрун В. *Крык.* Мінск, 1993, с. 20.

[1]Пойма – рэчышча
[2]Зэк – так са сталінскіх часоў сталі называць зняволеных; палітычны вязнень
[3]Кірка – прылада з вострым наканечнікам для разбівання скамянелых рэчываў (камня, скамянелага снегу).
[4]Папраз – праз; прыстаўка па- служыць узмацненню
[5]Пурга – снежная бура; завіруха
[6]Прашманаць – ператрасці; перашукаць
[7]«Сіксот» – ад расійс.: сексот — секретный сотрудник (сакрэтны супрацоўнік) ЧК, ГПУ, НКВД, КГБ; тут — даносчык

**Тэма 2: Прааналізуй прыведзеныя фрагменты твора Уладзіміра Арлова *Час чумы* і ахарактарызуй адносіны паміж Эразмам Вітэліусам і Міколам Гусоўскім.**

[...] Эразму ўзгадалася, як гутарыў з Гусоўскім, прачытаўшы першую палову «Песні». Пасол і тады прызнаваўся сабе, што перадусім дбае, каб паэма спадабалася папу. Але ж ён і быў спярша дыпламатам, паслом, а мецэнатам ужо потым. І вось калі «Песня пра зубра» гатовая, папа ляжыць на Божай пасцелі, а ён пачынае саромецца той размовы.

Спачатку ён шчодра хваліў бездакорную метрыку паэмы, казаў пра свежасць і паўнагучнасць радкоў.

– Пушчу, паляўнічых і князя Вітаўта напісаў вялікі майстар, – шчыра захапляўся ён. – Ты дасягнуў амаль немагчымага. Ты выпускаеш рой стрэл па заганах грамадства. Твая паэма ператвараецца ў палітычны трактат, але пры гэтым застаецца высокай паэзіяй. Твой паранены зубр – цудоўная алегорыя Айчыны, увасабленне яе лёсу і сімвал яе былой велічы.

Гусоўскі слухаў, нічым не выяўляючы пачуццяў. За лета ён прыкметна змяніўся. Вочы не згубілі сваёй жвавасці і вастрыні, але як быццам выцвілі і зрабіліся пакутніцкімі. Шырокія рамёны, як і раней, дыхалі дужасцю, але прыгорбіліся, нібыта ён дзень пры дні трымаў на іх нейкі вялікі цяжар. Вітэліус памятаў пачуццё, якое кранула тады ягонае сэрца. Ён ведаў, што ў Рыме зноў з'явілася Франчэска. Ён хацеў бы суцешыць Гусоўскага, узяць частку ягонага цяжару на свае плечы, але ж ён ведаў, што менавіта пакуты, а не душэўная раўнавага могуць удыхнуць у радок, у карціну ці ў мелодыю тую боскую субстанцыю, якая робіць іх неўміручымі. Замест суцяшальных слоў гучалі іншыя.

– Я пакрывіў бы душою, – гаварыў ён, – калі б змаўчаў пра тое, што адмаўляюцца прыняць маё сэрца і мой розум. Ты пішаш пра выпрабаванні ведзьмароў вадою, пра мяса глушца і іншыя паганскія звычаі і прымхі[1]. Ці прыспорыць гэта пашаны нашаму краю?

– Няўжо монсеньёру здалося, што падобныя дзікунскія выпрабаванні мне да душы? – адказваў Гусоўскі. – Але ж звычаі адрозніваюць адзін народ ад другога. Лепшыя з іх – такая ж святыня, як мова і воля. Хіба знойдзем мы ў даўніх звычаях глыбокія заганы? Святасць маці прызнаюць нават тыя народы, што не шануюць дзевы Марыі. Нібы ветрам адносіць нас ад абрадаў і завядзёнак[2], якіх трымаліся продкі. Ці не ператворымся хутка ў адсохлую ад каранёў траву-пералёт?

– Ты насмельваешся кідаць выклік самому боскаму Дантэ, – не ўступаючы ў спрэчку, казаў далей Вітэліус. – Дантэ выкрываў тых, хто ўжо трапіў у замагільны свет, і караў грэшнікаў рукамі незямных істотаў. Ты ж бярэшся судзіць тых, каго мае ўладу судзіць толькі неба. Да таго ж разумны чытач адразу заўважае, што ты маеш за дзіва не стварэнне свету, а ягонае існаванне...

Гусоўскі больш не пярэчыў , і тады ён, Вітэліус, хацеў чуць у паэтавым маўчанні згоду. Цяпер жа яму праглася, каб у тым цяжкім маўчанні была якраз нязгода. Ён ведаў, што не зможа парушыць свае прынцыпы і забраць уласныя словы назад, і прасіў неба, каб Міколу хапіла сілы самому адкінуць ягоныя няшчырыя парады.

– Лёс даўно за намі, Nicolaus. Атропа[3] стамілася віць нітку майго жыцця. – Мецэнат неяк прабачліва ўсміхнуўся. Ягоны твар зліўся з беллю высокіх падушак. [...] Адкінуўшыся на падушкі, ён перадыхнуў і загаварыў далей:

– Учора я зноў чытаў тваю «Песню...». Год назад ты не згадзіўся са мною. Ты не прыняў маіх парад, і цяпер я хачу прызнацца, што рады гэтаму. Тады маімі вуснамі гаварыў абачлівы пасол... Я рады, што ты нагадваеш валадарам пра іх злачынна забытыя абавязкі... У сваёй «Песні...» ты філосаф і географ, гісторык і жывапісец,

[1] Прымхі – забабоны, забабонныя прыкметы
[2] Завядзёнка (размоўна) – звычай, традыцыя
[3] Атропа – у грэчаскай міфалогіі: адна з Мойраў – багінь жыцця і смерці, якая перарэзвае нітку жыцця, калі прыходзіць яго канец

але заўсёды і найперш ты – паэт. Nicolaus, сёння ты першы паэт Кароны і Княства. Твае пачуцці разрываюць абалонку чужых слоў, і ў лаціне я чую мову нашага краю. Кожны вялікі мастак мае твор, які эліны[4] называлі помнікам. У ім застаецца сама душа творцы. Разам з ім мастак перадае наступнікам непадлеглы тленню[5] вобраз эпохі і Бацькаўшчыны. Ты збудаваў сабе такі помнік...

– Монсеньёр... Гэты помнік мы будавалі разам... – Ён памкнуўся быў падысці да ложка, але позірк мецэната спыніў яго.

Некалькі хвілін у апачывальні[6] трывала маўчанне. Таму, хто захварэў на чуму, паратунку ўжо не было, і Гусоўскі з жывым болем думаў, як цяжка Эразму паміраць. Ягоная мара аб’яднаць Еўропу супроць Асманскай імперыі засталася адно мараю. [...] Упершыню ў жыцці Гусоўскі думаў пра Вітэліуса не як пра мецэната. Эразм быў адзіным братам, які па волі жорсткага лёсу назаўжды пакідаў яго.

Па-свойму, але тое ж самае адчуваў і Эразм. Мяжа, што некалі ляжала паміж імі, знікла, яе знесла сама плынь часу, якая змывае ўсё спароджанае чалавечаю мітуснёй і забабонамі. Імкненне ўгору, да ўлады, да кардынальскае мантуі сплыло ў мінулае. У неварацьׂ[7], а будучыняй быў цяпер адно гэты чалавек, якога ён, ні на каліва[8] не пакрывіўшы душой, назваў бы не толькі першым паэтам сваёй дзяржавы, але і адным з першых паэтаў Еўропы, годным стаць поруч з Петраркам. Аднак мудрэц, што прамовіў гэтае зваблівае «Scripta manent» – «Напісанае застанецца», памыліўся. Ён, Вітэліус, ведае, як шмат з напісанага і вартага перажыць стагоддзі не перажыло і сваіх творцаў, і таму, сабраўшы сілы, ён гаворыць пра галоўнае:

– Папа Лявон ужо даўно ў лепшым свеце. Прыйшла мая чарга. У Рыме цяпер лёгка знайсці смерць, а не апекуна, які дапаможа выдаць тваю «Песню...». Ты не знойдзеш яго і сярод палякаў, бо ты славіш не Ягайлу, а Вітаўта, не гісторыю Кароны, а мінулае Вялікага княства. І ўсё ж едзь у Кракаў. Напішы да каралевы Боны. Яна шануе мовы і высока ставіць паэтычнае слова. Ты ведаеш, яна фундуе школы і заахвочвае маладых беларусінаў вучыцца ў італьянскіх універсітэтах. Напішы да яе і нагадай, што любая дзяржава мусіць больш абапірацца не на сілу зброі, а на моц духу. Нагадай, што рымляне і эліны былі магутныя тады, калі квітнелі мастацтвы, а як толькі пачалі нікнуць таленты, пачаўся і заняпад дзяржавы. Адразу ж па маёй смерці...

– Настаўнік...

Невядома, хто з нас настаўнік, з горыччу падумаў Вітэліус.

– Па маёй смерці ты атрымаеш грошы, якіх вам хопіць на дарогу да Кракава.

Гусоўскі паднёс слабую руку мецэната да вуснаў. Гэта ягонае вам ...

– Дай мне слова, што ты не памрэш, пакуль не надрукуеш «Песню...», – сказаў Вітэліус.

Арлоў У. *Час чумы // Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ.* Склад.: В. Сянкевіч і Я. Грыгарук. Warszawa, 2001, s. 301-304.

[4]Эліны – старажытныя грэкі
[5]Непадлеглы тленню – які не загнівае, не разбураецца; тут даўгавечны
[6]Апачывальня – пакоі для адпачынку; спальня
[7]Неварацьׂ – у незваротную мінуўшчыну; беззваротна мінула
[8]Каліва – сцябло травы; тут: у самай малой меры; у нічым

# CZYSTOPIS

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

# BRUDNOPIS